ХАРЧАВАННЕ Ў СТАЛЫМ ВЕКУ 8

УЗРОСТ МІРСКАГА ЗАМКА 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 КАСТРЫЧНІКА 2018 г. СЕРАДА № 200 (28816)

ЛІЧБА ДНЯ

Br80,5 млрд,

або ў супастаўных цэнах 106,8 %, склаў аб'ём прамысловай вытворчасці ў Беларусі ў студзені — верасні ў бягучых цэнах да ўзроўню студзеня — верасня 2017 года. У тым ліку прамысловая вытворчасць у горназдабываючай прамысловасці павялічылася на 3,6 %; у апрацоўчай прамысловасці — на 6,9 %; у забеспячэнні электраэнергіяй, газам, парай, гарачай вадой і кандыцыянаваным паветрам — на 7,7 %. Індэкс прамысловай вытворчасці за верасень 2018 года да верасня 2017-га склаў 104,4 %. Ва ўсіх галінах апрацоўчай прамысловасці аб'ём прамвытворчасці за студзень — верасень 2018 года перасягнуў узровень дзевяці месяцаў 2017-га.

КАРАТКА

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб зацвярджэнні складу аргкамітэта па святкаванні 75-годдзя вызвалення Беларусі і Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Узначаліў аргкамітэт прэм'ер-міністр Сяргей Румас.

• Прадстаўніцтва Дзяржбанка развіцця Кітая адкрылася ў Мінску.

• Працоўныя пенсіі ў Беларусі могуць быць павышаны на 5,3 % з 1 ліпеня. Адпаведны праект указа ўнесены ў Адміністрацыю Прэзідэнта.

• ВУП Беларусі ў студзені — верасні 2018 года вырас на 3,7 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

ISSN 1990 - 763X

«КОНЕМАБІЛЬ» У ДЗЕЯННІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жывёлавод з вёскі Княжыцы Шклоўскага раёна Аляксей УСІКАЎ любіць не толькі коней (у яго іх тры), але таксама і тэхніку — машыны. Каб камфортней было дабірацца да фермы і на пашу, ён уласнаручна сабраў вось такі «конемабіль». У багажніку старой «Аўдзі» возіць плуг, у кабіне — магнітола, вентылятар, клаксон. Замест руля — лейцы. А яшчэ запальваюцца паваротнікі. Можна сказаць, усё — па апошнім слове тэхнікі.

Аляксей працуе на ферме болей за дзесяць гадоў, не раз атрымліваў падзякі за сваю работу ад кіраўніцтва гаспадаркі і раёна.

Камунальныя стасункі

ФОРМУЛА КІРАВАННЯ ЖЫЛЛЁМ

Давер уласнікаў, дапамога дзяржавы і навучаныя прафесіяналы

У Беларусі створаць школу навучання спецыялістаў па кіраванні нерухомасцю, перад пачаткам капрамонту будуць праводзіць грамадскія слуханні па тарыфах жыллёва-камунальных паслуг, а мясцовыя ўлады, якія займаюцца пытаннямі дзейнасці таварыстваў уласнікаў, стануць павышаць свае веды. Пра змены ў Жыллёвы кодэкс Беларусі, неабходнасць дыялогу паміж уладамі і ўласнікамі, абавязковую дапамогу дзяржавы і шмат што іншае гаварылі ўдзельнікі канферэнцыі па прафесійным кіраванні жыллём, якую сёлета ўжо дзявяты раз арганізавала Міжнародная асацыяцыя менеджменту нерухомасці (МАМН).

СТАР. 4

Мазгавы штурм

ШКОЛА ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

У трэндзе — медыянавыкі, гейміфікацыя і сторытэлінг

«Што для мяне EdCamp? Магчымасць сустрэцца з настаўнікамі з усёй Беларусі, якія ўжо сталі сябрамі падчас такіх жа нефармальных канферэнцый і фестываляў. Магчымасць быць вольнай у выбары. Магчымасць пачуць безліч цікавых ідэй! Гонар за тое, што ў нас столькі неабыякавых і цікавых педагогаў! Неверагодная колькасць прыёмаў у «скарбоначку». Нейкі выбух мозга! Зараз адбываецца бесперапынная рэфлексія, і мяне не пакідае думка, што мне мала! Так шкада, што немагчыма было разарвацца, бо хацелася пабываць на ўсіх майстар-класах, якія праходзілі адначасова. Мінулы EdCamp быў цікавы, а гэты нейкі неперадавальна яскравы і эмацыянальны... Сапраўднае адкрыццё — мноства маладых і бясконца таленавітых настаўнікаў. Гэта разбурэнне стэрэатыпаў пра тое, што ў педагогі ідуць толькі тыя, каму больш нікуды для паступлення балаў не хапіла. Гэта крута назіраць і радасна! З кожным разам усё больш і больш люблю гэту «настаўніцкую тусоўку», якая множыцца, але становіцца ад гэтага яшчэ больш якаснай і цікавай. Столькі апантаных сваёй справай настаўнікаў (і не толькі) на адзін квадратны метр плошчы не часта сустрэнеш. Няхай нам усім хопіць сіл, каб дачакацца наступнай сустрэчы», — падзялілася сваімі меркаваннямі пасля завяршэння другой педагагічнай неканферэнцыі настаўніца пачатковых класаў з сярэдняй школы № 1 Лагойска Святлана ІВАНЮШЫНА.

СТАР. 7

ВЫКАНАЦЬ АБЯЦАНАЕ

Праграма, прынятая на V Усебеларускім народным сходзе, мусіць быць рэалізавана

Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам Сяргея Румаса.

Аснова, а потым дапаўненні

У пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы выказаўся наконт прапановы прэм'ер-міністра па праграме дзейнасці ўрада на 2019—2020 гады. «Я так паглядзеў гэтыя ўсе матэрыялы і разумею, што праграма, прынятая на Усебеларускім народным сходзе, непахісная, і яна павінна быць выканана, — падкрэсліў ён. — У адваротным выпадку — з чым мы прыйдзем да народа? У рамках і параметрах гэтай праграмы — калі ласка, любыя мерапрыемствы ўрада я толькі буду вітаць. Галоўнае, каб быў вынік».

Прэзідэнт дадаў, што ўсе мерапрыемствы былі вывераныя. «Мы людзі вопытныя, нам ужо эксперыментаваць няма чаго, наўрад ці знойдуцца пытанні для нейкіх эксперыментаў. Нават прапановы, якія ішлі ад старога ўрада, і вы іх падтрымліваеце ў новым ўрадзе, па стварэнні на шэрагу прадпрыемстваў наглядальных саветаў — ніякіх пярэчанняў не будзе, але будзе вельмі сур'ёзны кантроль і за дзейнасцю ўрада па рэалізацыі гэтых прапаноў, і асабліва кантроль за тымі старшынямі наглядальных саветаў, якія будуць прызначаны на гэтыя пасады», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Цэнтральны пасыл Прэзідэнта наступны: можна праводзіць любыя мерапрыемствы, аднак неабходна выканаць асноўную праграму — абяцанні народу.

Грошы — не з неба

Што датычыцца сацыяльных пытанняў, то тут кіраўнік дзяржавы спыніўся на двух момантах — заработная плата і пенсіі. Ён заявіў, што ўрад палічыў, што «сёлета рэальныя пенсіі мы павысім дзесьці на 8-9 %». Такое становішча спраў беларускі лідар назваў нядрэнным, пры гэтым дадаўшы, што трэба рухацца і далей у наступным годзе. «Мы плануем, што ў нашай краіне заработная плата ўжо пераваліць праз тысячу рублёў за кошт таго, што мы падымем заработную плату ў нізкааплатных слаёў насельніцтва».

Паводле слоў Прэзідэнта, і па гэтых пытаннях рашэнні прынятыя, яны таксама знаходзяцца на кантролі. «І ўрад хай павольна, але ў гэтым кірунку рухаецца. Усе людзі павінны разумець, што грошы павінны быць зароблены», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Рабіць трэба сваё

Акрамя таго, Прэзідэнт закрануў яшчэ два пытанні — імпартазамяшчэнне і пасярэдніцтва.

«Я вось гляджу, як некаторыя нашы службовыя асобы целяпаюцца, у тым ліку ў Оршы, іншых гарадах — ах, што мы размесцім на свабодных плошчах? Імпартазамяшчэнне, Сяргей Мікалаевіч, трэба размяшчаць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У прыклад беларускі лідар прывёў зборку легкавых аўтамабіляў: пакуль колькасць дэталяў айчыннай вытворчасці там не перавышае 50 %, а трэба, каб усе выраблялася ў Беларусі. Прэзідэнт прапанаваў рабіць самастойна тыя ж сядзенні, а з цягам часу — рухавікі і трансмісіі. Несумненна, для гэтага неабходны тэхналогіі, аднак Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэтага ў свеце хапае, — іх трэба браць, купляць адпаведнае абсталяванне і вырабляць па імпартазамяшчэнні ўсё, што неабходна, — «ад зубачыстак да рухавікоў».

«Таму імпартазамяшчэнне — гэта вельмі важнае пытанне, нічога не трэба прыдумляць, трэба ставіць станкі, тэхналагічнае абсталяванне і вырабляць камплектуючыя для нашых хай нават гігантаў — МТЗ, МАЗ, БелАЗ і гэтак далей. Мора работы», — канстатаваў ён.

Што датычыцца пасярэдніцтва, то па гэтай тэме кіраўнік дзяржавы расказаў, што вывучыў карупцыйныя схемы, за што людзі ідуць у следчы ізалятар, а потым і ў турму. «І перш за ўсё наш брат — чыноўнікі. І ўсе павязаныя пасярэдніцкімі схемамі. І што дзівіць: у нас пасярэднікі нават на беларускую прадукцыю. У Мінску вырабляюць і праз пасярэдніка мінскія ж прадпрыемствы купляюць, — дадаў ён. — Розныя бываюць там выпадкі і іншае, але гэта ўжо не тыя моманты, калі, ведаеце, у кагосьці грошы былі, у нейкага прыватніка, а наш спажывец не мог узяць у банку грошы. І вось ён ішоў да яго, той і працэнт меншы мог даць, і на гэтым былі завязаныя пасярэдніцкія структуры. Але ж пасярэднікі сёння ў вас, у банках бяруць грошы, ідуць, купляюць прадукцыю на нейкім прадпрыемстве і перапрадаюць тут жа нашым прадпрыемствам. Але гэта абсурд поўны, ды і трэба паглядзець пасярэднікаў па імпарце».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: ён не хоча выдаваць нейкія нярыначныя рэкамендацыі, але пасярэдніцтва стала праблемай. Камітэту дзяржаўнага кантролю было даручана заняцца гэтай праблемай, але пакуль руху няма, дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт даручыў прэм'ер-міністру ўзяць на кантроль і ўнесці прапановы да канца года па пытаннях імпартазамяшчэння і пасярэдніцтва.

Некалькі слоў пра спорт

Дарэчы, закрануў беларускі лідар і тэму айчыннага футбола (Сяргей Румас — старшыня Беларускай федэрацыі футбола):

«Калі мы не можам з Люксембургам і Малдовай гуляць, хоць я не хачу прынізіць Малдову — малайцы хлопцы, выйшлі, зубы сціснулі і гулялі як мае быць. Ну а нашы — як заўсёды. Таму вось наша ідэалогія. Вельмі шкада. Нешта нам трэба рабіць і з футболам, бо вось гэты добры ўсплёск, які адбыўся, ён заўтра згасне, і вы будзеце на ўзроўні гэтых дынамаўскіх хакеістаў гуляць. Але гэта асобная тэма, мы яшчэ да спорту вернемся».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

❍ Каментарый у тэму

РЭАЛЬНЫ РОСТ ПЕНСІЙ СЁЛЕТА СКЛАДЗЕ КАЛЯ 8 %

Пра гэта журналістам расказаў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас па выніках нарады з кіраўніком дзяржавы.

Ён адзначыў, што на сустрэчы з Прэзідэнтам праінфармаваў яго аб выніках работы эканомікі за тры кварталы бягучага года. Па выніках верасня эканамічны рост, які ёсць у краіне сёлета, стабілізаваўся на ўзроўні 3,7 %. Акрамя таго, усе сем ключавых паказчыкаў дзейнасці ўрада выкананы. Інфляцыя знаходзіцца ў межах гадавога параметра, нягледзячы на «ўсплёск», які адбыўся ў жніўні. Індэкс спажывецкіх цэн павялічыўся на 3,7 % і, па разліках урада, па выніках 2018 года не выйдзе за межы 6 %.

Таксама Сяргей Румас нагадаў, што ўрад скончыў работу над праграмай дзейнасці, аднак перад унясеннем яе ў парламент спатрэбілася ўдакладніць у кіраўніка дзяржавы асобныя яе аспекты. Як ужо адзначаў беларускі лідар, праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны на 2016—2020 гады, а таксама шэраг яго даручэнняў, абвешчаных у яго пасланні ў красавіку бягучага года, павінны быць выкананыя.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, усе гэтыя задачы ўлічаны, згаданы дакумент перафарматаваны ў іншым выглядзе. Кожны з 20 раздзелаў вызначае мэту і задачы, механізмы іх выканання, індыкатыўныя параметры, якія будуць з'яўляцца сведчаннем выканання або невыканання гэтых задач. За кожным з раздзелаў праграмы замацаваны кіраўнікі ўрада, ключавыя міністры. «Гэты дакумент пасля нязначных дапрацовак будзе ўнесены ў парламент ва ўстаноўлены тэрмін (да 18 кастрычніка)», — дадаў ён.

ЗНОЎ ПРА ГРОШЫ

Выказаўся Сяргей Румас і з нагоды заробкаў. «Мы разлічваем, што, калі з'явяцца даныя верасня, у краіне сярэдні заробак выйдзе на тысячу рублёў, — і гэты паказчык павінен захавацца да канца 2018 года. Налета кіраўнік дзяржавы даручыў ураду зрабіць асноўны ўпор на асоб, якія атрымліваюць невысокую заработную плату, і ўрад рыхтуе сёння пералік мер для таго, каб заробак у нізкааплатных слаёў насельніцтва рос больш высокімі тэмпамі», — сказаў кіраўнік урада.

Ён таксама дадаў, што такі рост заработнай платы не дазволіў ураду ўтрымаць суадносіны сярэдняй пенсіі да сярэдняй заработнай платы на ўзроўні 40 %. Па стане на 1 жніўня гэты паказчык роўны 36,2 %. «Сёння кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову ўрада і даручыў унесці пакет дакументаў па яшчэ адным (трэцім на працягу гэтага года) павышэнні пенсій у сярэднім на 5,3 %. Такім чынам, з улікам гэтага павышэння рэальны рост пенсій сёлета складзе каля 8 %», — адзначыў Сяргей Румас.

Як вынікае з вышэйсказанага, з 1 лістапада пенсіянеры атрымаюць пяцідзесяцэнтную прыбаўку да пенсіі.

Што датычыцца 2019 года, то тут Прэзідэнт даручыў, каб суадносіны ў 40 % сярэдняй пенсіі да сярэдняй зарплаты былі адноўлены і іх выкананне было адным з ключавых паказчыкаў у рабоце ўрада.

Таксама прэм'ер-міністр расказаў, што сёлета мы застанёмся ў калідоры па назначанай інфляцыі да 6 %. На наступны год у прагнозных дакументах — зніжэнне інфляцыі да 5 %. На яго думку, сёння адсутнічаюць негатыўныя фактары, якія б сведчылі пра тое, што паказчыкі інфляцыі не будуць выкананыя.

УВАГА ДА ДЭТАЛЯЎ

Імпартазамяшчэнне. Па гэтым кірунку Сяргей Румас заявіў, што сёння ў кожным міністэрстве ёсць даручэнне аб уважлівым аналізе імпарту, які закупляе наша краіна. Гэта робіцца для таго, каб арганізаваць пры адпаведных аб'ёмах вытворчасць такіх тавараў у Беларусі. Дарэчы, Орша — прыклад таго, як на практыцы дадзеныя даручэнні будуць выконвацца. У гэтым горадзе ёсць некалькі буйных заводаў, якія маюць лішнія плошчы, — яны ж могуць стаць пляцоўкамі для размяшчэння імпартазамяшчальных вытворчасцяў, у прыватнасці для айчыннага аўтамабілебудавання.

Пасярэдніцтва. Ці можна адмовіцца ад яго ва ўсіх сферах? І ці трэба? Як дзейнічаць? Можа, чагосьці не хапае ў заканадаўчай сферы? У адказ на гэтыя пытанні прэм'ер-міністр адзначыў, што ні ў адным з даручэнняў няма поўнай забароны на пасярэдніцтва, паколькі ў некаторых сферах яно проста неабходна. Узяць тыя ж прадуктовыя крамы: не пойдуць жа людзі купляць кожны тавар наўпрост да вытворцы. Такім чынам, у некаторых сферах пасярэдніцтва — неабходны элемент, ад яго не ўцячы.

Аднак, дадаў ён, выяўляецца шмат фактаў, калі тавар прадаецца, праходзячы праз некалькі рук, — і на кожным звяне гэтага ланцужка адбываецца павелічэнне кошту. Сяргей Румас растлумачыў пазіцыю кіраўніка дзяржавы: калі Прэзідэнт кажа аб выкараненні пасярэдніцтва, ён у першую чаргу мае на ўвазе вось такія прыклады, якія прыводзяць да неканкурэнтаздольнасці айчыннай прадукцыі, незаконнага ўзбагачэння прадпрымальнікаў.

Па гэтай тэме ва ўрадзе ёсць тры даручэнні беларускага лідара, на сённяшні дзень ужо праведзена вялікая работа па выбудоўванні аптымальных з пункту гледжання эканамічнага сэнсу спосабаў продажу як беларускай прадукцыі, так і імпартнай. На думку прэм'ер-міністра, гэта пытанне павінна знаходзіцца на пастаянным кантролі, таму што прадпрымальнікі здольныя выдумляць усё новыя і новыя схемы, якія не заўсёды могуць быць добрыя для нашых вытворцаў. На вяршыні павінна стаяць эканамічная мэтазгоднасць, пераканаць кіраўнік урада.

Парламенцкі дзённік

НОВАЕ Ў ЗАКАНАДАЎСТВЕ

На чарговым пасяджэнні дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі разгледзелі дзесяць пытанняў. У гэты спіс увайшлі змяненні законаў, якія датычацца пагранічнай бяспекі, трансплантацыі органаў і асабліва ахоўных тэрыторый.

Змяненні ў закон «Аб транспланталогіі органаў і тканак чалавека» пракаментаваў **Алег РУМО, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.** «За апошні час мы сталі заўважаць, што колькасць трансплантацый ад жывых родных донараў у нашай краіне стала паступова памяншацца. Гэта абумоўлена цэлым шэрагам прычын, галоўнай з якіх з'яўляецца спецыфіка нашага грамадства. Беларускія сем'і, на жаль, малаколькасныя. І таму знайсці абсалютна здаровых людзей у гэтых невялікіх сем'ях, якія гатовы ахвяраваць органы сваім родным, даволі цяжка. У гэтай сувязі мы прапаноўваем два новаўвядзенні, якія дазволяць, з нашага пункту гледжання, істотна пашырыць гэты спектр жывых бязвыплатных родных донараў, не згубіўшы пры гэтым якасць выканання аперацыйных умяшанняў», — адзначае ён. Цяпер кола жывых родных донараў пашырана: імі могуць стаць асобы, якія маюць агульных продкаў да прадзеда і прабабкі. «Другое найважнейшае змяненне датычыцца нашага міжнароднага супрацоўніцтва. Беларуская транспланталогія — гэта на сёння своеасаблівы брэнд нашай краіны, — лічыць сенатар. — У гэтай сувязі вялікая колькасць нашых заходніх партнёраў і нашых сяброў у Расійскай Федэрацыі гатовы супрацоўнічаць на ўзаемавыгаднай бязвыплатнай аснове ў абмене донарскімі органамі, у паляпшэнні якасці аказання транспланталагічнай дапамогі як у Беларусі, так і ў іншых краінах. Для гэтага неабходна мець вельмі празрыстую зразумелую заканадаўчую базу, якая паставіць гэты працэс у рамкі і дазволіць нам працаваць перш за ўсё для таго, каб нашым беларускім грамадзянам павялічыць колькасць аперацый і палепшыць якасць трансплантацый, якія выконваюцца».

У закон «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях» прапаноўваліся наступныя змяненні. Па-першае, гэта павелічэнне ўзросту донараў. Так, калі жанчына не можа самастойна вынасіць і нарадзіць дзіця, яе маці або сястра да 49 гадоў можа стаць донарам яйцаклетак або сурагатнай маці. У мужчын — донараў палавых клетак — павысілі верхнюю ўзроставую мяжу з 40 гадоў да 50.

Аляксандр СТАРАВОЙТАЎ, член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, каментуе: «На сёння Рэспубліка Беларусь мае каля 14 % бясплодных пар. Гэта даволі высокі паказчык. Ён яшчэ не крытычны. Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, крытычным паказчыкам па бясплоддзі з'яўляецца 16 % і больш. Улічваючы, што медыцына развіваецца, ёсць розныя віды тэхналогій, якія дазваляюць зрабіць пары шчаслівымі, а жанчыну зрабіць матуляй, то кожны год у Беларусі ўсё больш і больш дзяцей нараджаюцца шляхам экстракарпаральнага апладнення. І гэты працэс нельга тармазіць, яго трэба развіваць».

На гэтым пасяджэнні разглядаўся і адзін законапраект, які быў унесены непасрэдна дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў. Ён датычыцца асабліва ахоўных тэрыторый. Дакумент напоўнены нормамі прамога дзеяння і ўніверсальнымі механізмамі, звязанымі з работай з асабліва ахоўнымі прыроднымі тэрыторыямі. Таксама ён накіраваны на дасягненне Мэты ўстойлівага развіцця № 15 «Захаванне экасістэм сушы».

Анатоль ЛАПО, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі, расказаў пра эксперымент у прапускным пункце Казловічы, дзе праязджае грузавы транспарт. Там мытныя органы на працягу трох месяцаў выконвалі функцыі і пагранічнага кантролю. Вынікі станоўчыя, у тым ліку скараціўся час праходжання афармлення. Плануецца, што з лютага 2019-га частка функцый пагранічнага кантролю будзе перададзена мытным органам у пункце пропуску. Таксама законапраект пашырае пералік дакументаў, з якімі грамадзяне маюць права знаходзіцца ў пагранічнай зоне (зараз толькі з пашпартам).

Таксама Анатоль Лапо пракаментаваў для журналістаў сітуацыю на ўкраінскай граніцы: «За гэты год толькі нашы ўкраінскія калегі-пагранічнікі на беларуска-ўкраінскай граніцы затрымалі каля 100 адзінак зброі, каля 12 тысяч боепрыпасаў і некалькі дзясяткаў гранат. Мы, беларускія пагранічнікі, затрымалі за гэты перыяд каля 80 адзінак зброі і каля 1200 боепрыпасаў. Мы адзначаем, што такая праблема ёсць, і яна не можа не хваляваць як кіраўніка дзяржавы, так і пагранічнікаў. І мы, пагранічнікі абедзвюх краін, зробім усё, каб гэтыя патокі спыніць. Мы працуем у звязцы».

Надзея АНІСОВІЧ.

МАЛАДЗЁЖНЫ МАРАФОН

«Камсамолу — 100: эстафета пакаленняў»

Сёння ў Рэспубліканскім доме моладзі БРСМ дасць старт маладзёжнаму марафону пад такой назвай, прымеркаванаму да векавога юбілею Усесаюзнага камсамола.

Як расказалі ў Цэнтральным камітэце БРСМ, часткай мерапрыемства стане мабільная экспазіцыя, якая адлюстроўвае гісторыю станаўлення і ўмацавання маладзёжнага руху краіны: калекцыя камсамольскіх білетаў і значкоў розных пакаленняў, камсамольскія курткі байцоў студэнцкіх атрадаў, выразкі з камсамольскіх газет і часопісаў, пласцінкі з камсамольскімі песнямі, фатаграфіі, плакаты, падарункі і сувеніры, уручаныя ЦК камсамола. Многія экспанаты будуць прадстаўлены рэгіёнамі краіны.

Не абыдзецца юбілейны старт без камсамольскіх песень і вершаў, тэматычных фотазон і інсталяцый.

У дзень старту марафону арганізатары праекта кінуць кліч для збору камсамольскіх экспанатаў па ўсёй краіне. Ахвотныя змогуць перадаць іх з 17 па 25 кастрычніка ў Рэспубліканскі дом моладзі (Цэнтральны камітэт БРСМ, кабінет 63), самыя цікавыя ўвойдуць у тэматычную экспазіцыю і будуць прадстаўлены ўдзельнікам рэспубліканскага ўрачыстага сходу і святочнага канцэрта, прысвечаных юбілею камсамола.

Маладзёжны марафон «Камсамолу — 100: эстафета пакаленняў», які будзе праходзіць да 29 кастрычніка, падхопяць актывісты Саюза моладзі ў раёнах і гарадах краіны. Яны правядуць дыялогі пакаленняў, сустрэнуцца з камсамольцамі розных гадоў. Падчас сустрэч, а таксама пошукавай работы будуць запісаны гісторыі відавочцаў тых падзей, сабраны прадметы (узнагароды, фатаграфіі і іншае), якія адлюстроўваюць гісторыю камсамольскага руху ў кожным рэгіёне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Чулі?!

Мінск увайшоў у тройку самых чыстых гарадоў свету

Беларуская сталіца ўвайшла ў тройку самых чыстых гарадоў свету паводле рэйтынга амерыканскага інтэрнэт-рэсурсу фінансавых і аналітычных навін The Street.

Усяго ў спіс, складзены The Street, увайшлі 30 гарадоў, пры гэтым Менск размясціўся на трэцім месцы. «Сталіца і найбуйнейшы горад Беларусі часта рэкламуецца турыстычнымі сайтамі як самы чысты горад у свеце. Працавітыя работнікі клапоцяцца аб шматлікіх парках горада і рэгулярна падтрымліваюць на вуліцах чысціню», — гаворыцца ў апісанні горада.

Першыя два месцы ў рэйтынгу чыстых гарадоў занялі Сінгапур і Токіа. Услед за беларускай сталіцай, на чацвёртым месцы, размясціўся яшчэ адзін японскі горад — Кіёта. У дзясятку таксама ўвайшлі Казань, Медзіна, Абу-Дабі, Тайбэй, Цюрых, Стакгольм. Сталіца Расіі Масква заняла 14-е месца. Замыкае трыццатку амерыканскі Бостан.

Складальнікі рэйтынга засноўваліся на водгуках карыстальнікаў анлайн-сэрвісу браніравання жылля Booking.com.

ІНТЭРНЭТ-РОЎМІНГАМ БЕЛАРУСЫ КАРЫСТАЮЦЦА НАВАТ У МАЗАМБІКУ

Беларусы сталі спажываць больш інтэрнэт-трафіку ў замежных паездках. Аналізуючы BigData, эксперты МТС прагназуюць, што бягучы год стане рэкордным па аб'ёмах спажывання інтэрнэту. Надзвычай актыўным аказаўся сезон адпачынкаў: калі мінулым летам абаненты ў роўмінгу прапампавалі 244 907 МБ трафіку, то гэтым — 2 670 116 МБ, што значыць: інтэрнэт-трафік вырас больш чым у 10 разоў.

Бум спажывання інтэрнэт-трафіку ў МТС звязваюць з запускам паслугі «Unlim за мяжой». Яна дазволіла абанентам карыстацца інтэрнэтам у роўмінгу без абмежаванняў па аб'ёме, што, у сваю чаргу, змяніла стаўленне беларусаў да анлайн-роўмінгу, забяспечыла большы ўзровень свабоды, чым абаненты і скарысталіся.

А вось галасавымі званкамі ў роўмінгу сталі карыстацца радзей. Усе апошнія гады дынаміка галасавых кантактаў дэманструе адмоўную тэндэнцыю. У параўнанні з 2017 годам колькасць званкоў у роўмінгу зменшылася на 12 %. Тое ж самае датычыцца і SMS, колькасць якіх скарацілася на 21 %.

За летнія месяцы абаненты МТС наведалі больш за 120 краін. Найбольш актыўна інтэрнэт-трафік беларусы выкарыстоўвалі ў Расіі, Украіне і Турцыі. Акрамя таго, абаненты МТС часта знаходзіліся анлайн у Польшчы, Літве і Італіі. У першую дзясятку таксама ўвайшлі Германія, Іспанія, Латвія і Грэцыя.

Акрамя падарожжаў па топавых напрамках, беларусы гэтым летам наведвалі і экзатычныя краіны, напрыклад Мазамбік, Перу, Грэнландыю, Панаму і Аргенціну.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

NBC: у ЗША фіксуюць рост колькасці кібератак на інфраструктуру, якая задзейнічана на выбарах

ЗША фіксуюць павелічэнне колькасці спроб арганізацыі кібератак з боку невядомых хакераў на амерыканскую інфраструктуру, што задзейнічана пры правядзенні выбараў. Пра гэта паведаміла тэлекампанія NBC.

Яна спасылаецца на даклад аднаго з аддзяленняў міністэрства ўнутранай бяспекі ЗША, які трапіў у яе распараджэнне. «Нам стала вядома аб узрослай колькасці кібератак, нацэленых на выбарчую інфраструктуру ў 2018 годзе», — адзначаецца ў ім. У лістападзе ў ЗША пройдуць прамежкавыя выбары ў Кангрэс.

У дакладзе гаворыцца, што невядомыя хакеры «на рэгулярнай аснове» здзяйсняюць такія напады з рознымі мэтамі, у тым ліку для таго, каб выклікаць раскол у грамадстве, выкрасці канфідэнцыяльныя звесткі і падарваць веру амерыканскіх грамадзян у выбарчыя працэсы, адзначае NBC. Па даных канала, ведамства пакуль не мае інфармацыі, хто можа стаяць за такімі нападамі, аднак усе яны былі папярэджаны або пацярпелі няўдачу.

Як паведамляе NBC, у дакладзе таксама гаворыцца пра спробы замежных дзяржаў, уключаючы Кітай і Расію, з дапамогай умяшання ў выбары паўплываць на палітычны клімат у ЗША.

Эквадор склаў правілы паводзін для Асанжа

Эквадор склаў для заснавальніка WikiLeaks Джуліяна Асанжа новы рэгламент паводзін на тэрыторыі пасольства краіны ў Лондане.

Новыя правілы забараняюць Асанжу адначасова прымаць больш за трох гасцей; кожны наведвальнік таксама павінен загадзя даслаць запыт па электроннай пошце. Асанж не можа рабіць заявы, якія могуць быць расцэненыя як умяшанне ў справы іншых дзяржаў, пад пагрозай пазбаўлення статусу бежанца.

Пасольства таксама больш не будзе аплачваць выдаткі Асанжа на харчаванне, медыцыну і пральню, пакінуўшы за сабой толькі аплату камунальных паслуг. Асанж можа выходзіць у інтэрнэт з уласных прылад, а выкарыстанне камп'ютараў дыпмісіі ім магчыма толькі ў крайніх выпадках. Асобна ў правілах прапісана неабходнасць захавання Асанжам і яго гасцямі чысціні і правілаў гігіены: у прыватнасці, заснавальнік WikiLeaks павінен сам карміць свайго ката і прыбіраць за ім.

Урад Эквадора, які прыйшоў да ўлады ў 2017 годзе, узяў курс на паляпшэнне адносін з ЗША і Вялікабрытаніяй. З-за гэтага новае кіраўніцтва рэспублікі публічна называе сітуацыю з Асанжам «праблемай».

Прадказана падзенне аб'ёмаў вытворчасці піва з-за змены клімату

Вучоныя ўніверсітэта Усходняй Англіі высветлілі, што глабальнае пацяпленне прывядзе да змяншэння аб'ёмаў вытворчасці ячменю — асноўнага інгрэдыента піва. У выніку засух, якія паўплываюць на сельскагаспадарчыя культуры, спажыванне алкагольнага напою ў свеце ўпадзе на 16 працэнтаў. Пра гэта паведамляе выданне Science Alert.

Вядома, што кліматычныя змены знізяць вытворчасць кавы і віна. У новым даследаванні спецыялісты вызначылі, што рост глабальнай сярэдняй тэмпературы таксама адаб'ецца і на даступнасці піва. Паводле ацэнак, у залежнасці ад складанасці ўмоў надвор'я можа быць страчана да 17 працэнтаў ураджаю ячменю. Гэта, у сваю чаргу, прывядзе да значнага скарачэння аб'ёмаў вытворчасці піва і зніжэння яго спажывання на 29 мільярдаў літраў, што эквівалентна ўсяму піву, якое спажываецца ў ЗША. Акрамя таго, вучоныя прадказваюць рост цаны ў два разы ў сяродднім.

Эфект ад глабальнага пацяплення будзе найбольш значны ў Кітаі, дзе ўзровень спажывання піва самы высокі ў свеце. Чакаецца, што ў гэтай краіне продажы пеннага напою зменшацца на 4,3 мільярда літраў.

Крымінал

БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

Як паведамілі ў Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь, у Гомелі завершана расследаванне забойства таксіста, здзейсненага ў 1984 годзе.

34 гады таму, у ноч з 26 на 27 лютага на вуліцы Ільіча горада Гомеля двое мужчын селі ў таксі і па дарозе напалі на кіроўцу. Зламыснікі сціснулі яму шыю, пасля чаго нанеслі некалькі ўдараў тупымі прадметамі і шылам па розных частках цела. Пасля таго як аўтамабіль спыніўся, кіроўцу выцягнулі на вуліцу і збівалі далей. Затым бандыты перанеслі яго на бераг возера і пакінулі там ляжаць на марозе. Ад атрыманых цялесных пашкоджанняў кіроўца таксі памёр.

Зламыснікі выкралі з аўтамабіля выручку, а таксама партманет, наручны гадзіннік, ключ ад кватэры, пасведчанне кіроўцы і іншыя рэчы пацярпелага.

Раскрыць тады злачынства «па гарачых слядах» праваахоўнікам не ўдалося. Але ў той жа час былі зафіксаваныя сляды далоняў аднаго з іх. Праз гады з упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гомельскай вобласці ва УУС Гомельскага аблвыканкама паступіла інфармацыя аб супадзенні гэтых слядоў з адбіткамі далоняў мужчыны, арыштаванага за рабаванне.

Расследаванне забойства таксіста было адноўлена. Пачалася карпатлівая праца па зборы доказаў віны названай асобы і высвятленні асобы яго саўдзельніка. Былі паўторна дапытаны ўсе сведкі, праведзены следчыя эксперыменты і вочная стаўка, праверaны паказанні на месцы здарэння з удзелам падазраванага з ужываннем відэагуказапісу. Па пастановах, вынесеных следчым, супрацоўнікамі УДКСЭ па Гомельскай вобласці праведзены шэраг экспертыз, у тым ліку дадатковыя судова-медыцынскія, дактыласкапічныя і медыка-крыміналістычныя экспертызы.

На падставе аналізу ўсіх сабраных па справе доказаў следства прыйшло да высновы аб дачыненні жыхара Рэчыцкага раёна да забойства таксіста. Яго дзеянні кваліфікаваныя па ч. 2 арт. 89 (разбой, здзейснены па папярэдняй змове групай асоб, з прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў), п. п. «а», «е» арт. 100 (забойства з карыслівасці, здзейсненае з асаблівай жорсткасцю) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (у рэдакцыі 1960 года).

Крымінальная справа вывучана пракурорам і накіравана для разгляду ў суд.

Правядзенне следчых дзеянняў і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, накіраваных на ўстанаўленне саўдзельніка злачынства, працягваецца.

Сяргей КУЛАКОЎ.

ФОРМУЛА КІРАВАННЯ ЖЫЛЛЁМ

Прыватнае паветра ў сценах агульнай уласнасці

Каб зацікавіць гаспадароў кватэр у клопаце пра ўласнае жыллё, трэба заваяваць іх давер і ўпэўніць, што ўсё, што робіцца дзяржавай, — дзеля іх і на доўгатэрміновую перспектыву. Рамачныя ўмовы, якія можа забяспечыць улада, добрая заканадаўчая база і давер уласнікаў, — формула, якая дазволіць дасягнуць прафесійнага кіравання жыллём у Беларусі. Так мяркуюць нямецкія спецыялісты, якія дапамагаюць наладжваць у нашай краіне палітычны дыялог і адаптаваць свой вопыт пры актуалізацыі беларускага заканадаўства.

— Слухаючы адно аднаго, мы вырашылі праблемы, якія былі ў нас у Германіі, і я ведаю, як з дапамогай палітычнага дыялогу дасягнуць гэтага тут. З аднаго боку, дырэктыўнымі рашэннямі зверху нічога не дасягнуць без падтрымкі людзей, з другога — незадаволенасць уласнікаў нічога не вырашыць без падтрымкі зверху, — упэўнены **Вернэр МЕРКЕЛЬ, старшыня праўлення МАМН.**

Сапраўды, у адзіночку ні дзяржава, ні ўласнік нічога не зробяць. З такім меркаваннем згодны ўсе ўдзельнікі канферэнцыі з васьмі краін, якія таксама маюць вопыт прыватызацыі і цяжкасцяў, з якімі яны сутыкнуліся. Спецыялісты ўпэўнены: забяспечыць неабходныя рамачныя ўмовы — задача дзяржавы, аднак пры гэтым яе ўдзел у жыцці ўласнікаў павінен абмяжоўвацца прынцыпам: столькі, колькі неабходна, але па магчымасці мала.

— Кватэра — толькі частка будынка, яна можа існаваць, толькі калі захоўваецца дом, — мяркуе Вернэр Меркель. — Тое, што чалавек набывае ва ўласнасць, — фактычна паветра, у межах якога можна рухацца і якое з усіх бакоў абкружана агульнай уласнасцю, асобна ад якой існаваць нельга. Неабходна дэкларацыя аб падзеле агульнай уласнасці, каб было разуменне, дзе агульная маёмасць, а дзе — прыватная.

Падтрымка дзяржавы патрэбна яшчэ і для таго, каб чалавек не адчуваў, што яго зрабілі ўласнікам прымусова. Прыватнага жылля ў Беларусі 94 %, аднак многія, пэўна, хацелі б ім не валодаць, а арандаваць на добрых умовах. Асабліва тыя, у каго няма сродкаў выконваць доўгатэрміновыя абавязкі ўласніка па аплаце паслуг і захаванні дома ў належным стане.

Пяць дзён на экзамен і 56 гадзін на навучанне

Прафесійных кіраўнікоў нерухомасцю ў нашай краіне дагэтуль не хапае. Няма прафесіяналаў з практычным вопытам, якія падрыхтавалі б адпаведных кваліфікаваных кіраўнікоў. Тым не менш Міністэрства ЖКГ прызнае, што кіраванне — гэта асноватворная паслуга, з дапамогай якой забяспечваюцца ўсе працэсы, звязаныя з эксплуатацыяй шматкватэрнага жылля, а прафесіяналізм у кіраванні — аснова якаснага абслугоўвання і камфортнага пражывання. Гэта дазваляе спадзявацца, што неўзабаве мы займеем кіраўнікоў, веды якіх будуць атрыманы не за два тыдні перакваліфікацыі, як цяпер, а на базе прафесійнай адукацыі.

Прафесія спецыяліста па кіраванні нерухомасцю сумеснага домаўладання абазначана ў Адзіным кваліфікацыйным даведніку пасад служачых. Сумесна з Мінжылкамгасам распрацавана дарожная карта, на падставе якой у наступным годзе пачнуць ствараць сваю беларускую школу навучання кіраўнікоў. І рабіць гэта трэба на базе каледжаў пры атрыманні трохгадовай сярэдняй спецыяльнай адукацыі, каб з часам падрыхтаваная моладзь змагла замяніць некваліфікаваных кіраўнікоў, якія цяпер часта абіраюцца на сходзе ўласнікаў з жыхароў-пенсіянераў, мяркуе **Генадзь КАЛЁНАЎ, выканаўчы дырэктар МАМН.**

— Дзяржаве жыццёва неабходны такі крок, бо рыхтаваць трэба не толькі кадры кіраўнікоў для таварыстваў уласнікаў (ТУ), а і спецыялістаў жыллёва-камунальных службаў. Сённяшнія курсы павышэння кваліфікацыі спецыялістаў сумежных прафесій, на якія даецца ў лепшым выпадку 56 гадзін навучання, — дыскрэдытуюць саму ідэю прафесіі спецыялістаў па кіраванні нерухомасцю. Такі чалавек пачынае працаваць, робіць памылкі, і, як вынік, кажуць, што ідэя самакіравання кепская. У Германіі пасля каледжа толькі экзамен у гандлёва-прамысловай палаце займае пяць дзён, а ў нас за два дні рыхтуюць спецыяліста?! А вось у каледжы моладзь за тры гады зможа атрымаць веды і вопыт, каб без практычных памылак кіраваць нерухомасцю.

Вучыць і рэалізоўваць

З неабходнасцю прафесіяналізацыі кіраўнікоў нерухомасцю, набыцця ведаў, якія можна атрымаць толькі шляхам перадачы вопыту, напрацаванага гадамі, і дыялогу з уласнікамі цалкам згодны і ў Міністэрстве ЖКГ.

— Улада павінна дапамагчы ўласнікам прыняць рашэнне, калі яны не могуць вызначыцца самастойна. Людзі павінны быць забяспечаны нармальнымі паслугамі, — лічыць **Генадзь ТРУБІЛА, першы намеснік міністра ЖКГ.** — Пры распрацоўцы змен у Жыллёвы кодэкс было шмат нюансаў і спрэчак, асабліва наконт павышэння патрабаванняў да старшынь праўленняў ТУ і іх прафесійнай падрыхтоўкі. Аднак нашы прапановы і вынікі дыялогу з прадстаўнікамі МАМН адлюстраваны ў праекце кодэкса, які будзе заслуханы ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў другім чытанні.

Скаргі на дзейнасць таварыстваў, з аднаго боку, звязаны з адсутнасцю кантролю мясцовымі ўладамі, з другога — недастатковым залучэннем уласнікаў у кіраванне сваім жыллём як удзельнікаў працэсу, а не назіральнікаў збоку. Менавіта таму сярод планаваных змен прадугледжана трансфармацыя ролі мясцовых выканкамаў з апякунскай на арганізатарскую. З гэтай нагоды мяркуецца арганізаваць навучанне і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў райвыканкамаў і адміністрацый раёнаў у гарадах, якія займаюцца пытаннямі дзейнасці ТУ, каб вызначыць крытэрыі ацэнкі ведаў такіх людзей, дадаў ён.

У планах у МАМН таксама нямала. Асацыяцыя рыхтуе брашуру «Жыллёвыя асацыяцыі: традыцыі, навацыі, стратэгія і ўстойлівасць», у якой будуць адлюстраваны напрацоўкі і рэкамендацыі шматгадовага супрацоўніцтва з нямецкімі спецыялістамі, адаптаваныя да беларускіх рэалій. Мяркуецца таксама ўкараніць у практыку спецыяльныя правілы да пачатку будаўніцтва і праектавання дома, а таксама замацаваць у законе ідэю даць магчымасць кіраваць нерухомасцю канфесійным арганізацыям.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прырода здзіўляе

«СЯМЕЙКА» НА ДАЛОНІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вось такі незвычайны падарунак у свой дзень нараджэння атрымаў Міхаіл РУДЗІНСКІ на «ціхім паляванні». Са сваёй спадарожніцай Галінай ён збіраў грыбы ў лясным урочышчы Ваўчынец, непадалёку ад пасёлка Парычы Светлагорскага раёна, і знайшоў сапраўднае дзіва — 13 грыбоў з аднаго «куста». Такую ўдачу пенсіянерам прынёс польскі грыб, які па смакавых якасцях нічым не саступае баравіку.

Факт

НЕБЯСПЕКА — АД НЕЗАРЭГІСТРАВАНЫХ ЖЫВЁЛ

Мінпрыроды падвяло вынікі маніторынгу месцаў утрымання дзікіх жывёл у няволі. Ён быў праведзены ў сувязі з неаднаразовым выяўленнем у апошні час выпадкаў парушэнняў у гэтай сферы.

Маніторынг праводзіўся ў дачыненні да дзікіх жывёл, якія адносяцца да відаў, уключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, альбо з'яўляюцца ўзорамі CITEC. Таксама былі абследаваны месцы ўтрымання дзікіх жывёл, адлоў якіх ажыццёўлены на падставе спецыяльнага дазволу ў мэтах іх утрымання або развядзення ў няволі.

Усяго па стане на 1 кастрычніка ў краіне зарэгістравана звыш 6 тысяч дзікіх жывёл, якія ўтрымліваюцца як у юрыдычных (85 месцаў утрымання), так і ў фізічных (25 месцаў утрымання) асоб.

У ходзе маніторынгавых мерапрыемстваў выяўлены шэраг парушэнняў, якія датычыліся невыканання патрабаванняў да ўтрымання дзікіх жывёл у няволі і парушэнняў парадку іх рэгістрацыі. Напрыклад, выяўлена восем незарэгістраваных жывёл у заалагічных парках, у кантактных заапарках, а таксама ў фізічных асоб. У трох выпадках парушаны парадак утрымання дзікіх жывёл.

Нязначная колькасць выяўленых парушэнняў звязана з тым, што пры рэгістрацыі дзікіх жывёл тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды сумесна са спецыялістамі-заолагамі ўжо былі праверацы законнасць валодання дзікімі жывёламі, а таксама ўмовы іх утрымання на адпаведнасць патрабаванням прыродаахоўнага заканадаўства.

Як паказаў маніторынг, зарэгістраваныя дзікія жывёлы ўтрымліваюцца ў асноўным з выкананнем патрабаванняў заканадаўства і самаадвольны іх выхад з месцаў утрымання практычна выключаны. Вялікую небяспеку для грамадзян уяўляюць незарэгістраваныя дзікія жывёлы, паколькі ў спецыялістаў адсутнічае магчымасць праверыць умовы іх утрымання.

«Звяртаемся да грамадзян, якія маюць якую-небудзь інфармацыю аб незаконным утрыманні або развядзенні ў няволі дзікіх жывёл: паведамляйце аб дадзеных фактах у абласныя, Мінскі гарадскі камітэты прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды будуць прыняты неабходныя меры рэагавання.

Перад набыццём дзікай жывёліны абавязкова пракансультуйцеся са спецыялістамі. Інфармацыю па пытанні рэгістрацыі дзікіх жывёл у няволі можна атрымаць па тэл. +375 17 200 62 61».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЛОЕЎ І ДОБРУШ БЫЛІ ВЫЗВАЛЕНЫ 75 ГАДОЎ ТАМУ

Юбілей вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў урачыста адзначылі невялікія раённыя цэнтры Гомельшчыны. Дзясяткі мерапрыемстваў нагадалі пра лёсавызначальныя для краіны падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Дарэчы, за вызваленне Лоеўскага раёна 365 воінаў былі ўзнагароджаны зоркай Героя Савецкага Саюза.

У райцэнтры з гэтай нагоды прайшла рэканструкцыя фарсіравання Дняпра і парад катараў пагранічнай камендатуры «Лоеў» вайсковай часці 1242. Дарэчы, напярэдадні адной з яе застаў было прысвоена імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Сушанава, які адным з першых пераправіўся цераз умацаваны фашыстамі Дняпро. Як расказала **дырэктар Лоеўскага музея бітвы за Дняпро Рыма СТАДНІКАВА**, у архіўных дакументах ёсць сведчанні пра тое, што Мікалай Сушанаў 15 кастрычніка 1943 года пры фарсіраванні ракі Дняпро на поўдзень ад Лоева пераправіўся з байцамі на правы бераг:

— Там адразу ж стварыў групу і павёў яе на знішчэнне агнявых кропак ворага. Закідаў гранатамі дзот і знішчыў варожы кулямёт з разлікам.

У добрушскіх праваслаўных храмах маліліся за мір. Там жа арганізавалі вахту Памяці і адкрылі мемарыяльныя дошкі на вуліцах, названых у гонар герояў Вялікай Айчыннай вайны: Іллі Уласенкі, Фёдара Хлуднева і Рымы Шаршнёвай. У райцэнтры таксама адбыліся публічная дэманстрацыя даследчых работ патрыятычнай акцыі «#ЗАРОДНЫКРАЙ» і пасадка дрэў на алеі каля мемарыяльнага комплексу «Памяць».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Семдзесят пяць свечак памяці

232 чалавекі ў канцы верасня 75 гадоў таму збеглі з працоўнага лагера ў Навагрудку пасля больш як года нямецкага палону. То былі апошнія яўрэі гэтай зямлі і самыя масавыя і паспяховыя ўцёкі ў акупаванай Еўропе.

Мітынг-рэквіем з гэтай нагоды арганізавалі на тэрыторыі экспазіцыі «Музей яўрэйскага супраціўлення». Нашчадкі тых, хто капаў тунэль да волі, з'ехаліся з розных краін, каб на свае вочы пабачыць мясціны, дзе іх родныя выратавалі сваё жыццё, і аддаць даніну павагі мужнасці вязняў. Разам з жыхарамі Навагрудка яны запалілі сімвалічныя 75 свечак. Дзясяткі свечак устанавілі і на Сцяне памяці побач з імяннымі таблічкамі ўцекачоў.

— Вайна — гэта заўжды страх, боль і ахвяры, калі дзеці застаюцца сіротамі, а бацькі рана сівеюць. У гады Вялікай Айчыннай вайны Навагрудчына згубіла больш за 45 тысяч мірных жыхароў. Страшнай старонкай гісторыі стаў Халакост. Аднак людзі не скарыліся, а сталі змагацца. Яркі прыклад гэтага — яўрэйскае супраціўленне, — выказаўся **Анатоль МАРКЕВІЧ, старшыня Навагрудскага райвыканкама.** — Нават у тых страшных умовах людзі паказалі волю да свабоды і жыцця. Сёння яны знаходзяцца ў розных краінах, якія сталі для іх другой радзімай. Аднак мы ўпэўнены, што іх карані засталіся на навагрудскай зямлі.

Ірына СІДАРОК.

Спадчына

РАДЗІВІЛАЎСКІ ПАЛАЦ НЕ ЖАДАЕЦЕ?

Пяты раз спрабуюць прадаць з аўкцыёну будынак, які разбураецца

Былы палац Радзівілаў у Паланечцы Баранавіцкага раёна зноў выставілі на таргі — пяты раз за апошнія пяць гадоў. Не ўдаецца знайсці інвестара, які купіў бы гэты аб'ект і ўдыхнуў бы ў яго жыццё. Праўда, чатыры гады таму сядзібу набыла на аўкцыёне прыватная фірма, але... нічога не змагла зрабіць. І ў 2016 годзе палац вярнулі дзяржаве.

Так выглядае палац цяпер.

Старшыня Вольнаўскага сельскага Савета Наталля ІБРАГІМАВА гаворыць, што ў Паланечцы даўно чакаюць інвестара-бізнесмена, які рэстаўруе іх славутасць.

Наталля Пятроўна паказвае будынак, які гэтай вясной крыху пацярпеў. Прайшлі моцныя дажджы, у адным месцы фундамент падтапіла, сцяна часткова абрынулася. Будынак лічыцца аварыйным, уваходныя дзверы наглуха закрытыя.

— А раней, калі мы яшчэ заходзілі сюды, — працягвае старшыня сельвыканкама, — я неяк акінула вокам краявіды з вышыні другога паверха і не магла налюбавацца, такая прыгажосць! Нават праз гады, стагоддзі, калі час і прырода многае зруйнавалі, можна пазнаць сістэму азёраў у парку, алеі, задуманыя аўтарам сядзібы. А на першым паверсе захавалася плітка, якую варта толькі памыць, і ніякая рэстаўрацыя не патрэбна — гатовая падлога і музейны артэфакт. Хочацца спадзявацца, што знойдзецца чалавек, які ацэніць і прыгажосць, і культурна-гістарычнае значэнне гэтага аб'екта, і не пашкадуе сродкаў. Як лічаць дасведчаныя людзі, на адраджэнне сядзібы трэба не менш за адзін мільён долараў, — заключае старшыня сельскага Савета.

У пасляваенныя часы ў былым радзівілаўскім палацы размяшчалася сярэдняя школа. Яе толькі ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя перавялі ў іншы будынак. З той пары палац і пачаў разбурацца. Але гісторыю сваёй славутасці тут ведаюць, шмат матэрыялаў сабрала бібліятэкар Святлана Вяленка. У бібліятэцы захоўваецца калекцыя кніг па гэтай тэме.

Палац у Паланечцы быў пабудаваны на рубяжы XVIII–XIX стагоддзяў па праекце невядомага італьянскага архітэктара. Шырокую вядомасць сядзіба набыла пры князю Канстанціне з роду Радзівілаў. Ён хутка прасоўваўся па службе, у 1820 годзе быў членам Віленскай Адукацыйнай камісіі, камергерам імператарскага двара, прадвадзіцелем дваранства Навагрудскага павета, членам Гродзенскага губернскага папячыцельскага камітэта аб турмах. У 1845 годзе Канстанцін становіцца міністрам народнай асветы, у 63-м годзе пакідае пасаду «па стане здароўя».

Князь многа зрабіў для развіцця адукацыі і культуры ў родным краі. Яго клопатамі былі ўладкаваныя Навагрудскае дваранскае вучылішча і пансіён, Гродзенскі пансіён. Яго абіралі членам-супрацоўнікам Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства, куды ён дасылаў свае работы па **беларускай** мове і этнаграфіі. Вядомасцю карысталіся яго работы «Статыстычны нарыс Навагрудскага павета» і «Этнаграфічныя звесткі пра жыхароў Навагрудскага павета». У гэтым палацы, які сёння выстаўлены на аўкцыён, размяшчалася рэдакцыя часопіса «Людзі і час». Выданне планавалася прысвяціць матэрыялам па вывучэнні фальклору беларускага рэгіёна па Віліі і Нёмане. Канстанцін сябраваў з Уладзіславам Сыракомлем, які ахвотна прыязджаў у Паланечку, любіў тутэйшы «цудоўны сад», прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы часопіса.

Бібліятэка яго палаца налічвала каля чатырох тысяч тамоў, тут былі архіў, калекцыя карцін, рэдкія творы мастацтва. Галерэя з 38 партрэтаў прадстаўнікоў роду Радзівілаў размяшчалася ў сталовай. Лёс гэтых збораў і калекцый склаўся па-рознаму. Частку каштоўнасцяў сын Канстанціна Мацей вывез у Зегжу, маёнтак жонкі. Асобныя рэчы сталі часткай нясвіжскіх збораў. Архіў (дакументы XV—XIX стагоддзяў) захоўваецца ў Галоўным архіве старадаўніх актаў у Варшаве. Калекцыя кніг — у Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы. Многае страчана падчас вайнаў. Палац двойчы гарэў: у 1917-м і 1943 гадах. А вось Юр'еўскі касцёл, узведзены ў 1899 годзе Альбертам Радзівілам, добра захаваўся. Храм служыў магільным склепам апошніх гаспадароў маёнтка. Мае рэдкую рэліквію — арнат (верхняе адзенне ксяндза), пашыты з выкарыстаннем слуцкага пояса.

Палац на малюнку Напалеона Орды.

Прыгожа выглядае палац на малюнку Напалеона Орды. Тады гэта быў палацава-паркавы комплекс, які складаўся з палаца, аранжарэі, капліцы-склепа, брамы, млына, парка з вадаёмамі. Цяпер засталіся муры і дах палаца. У садзе захаваліся рэшткі агароджы з лесвіцамі. А на фасадзе палаца стаяць калоны з галовамі-скульптурамі старажытных філосафаў. Спецыялісты сцвярджаюць, што такога дэкаратыўнага элемента няма ні ў адным палацы на тэрыторыі Беларусі, і проста цуд, што гэтыя скульптуры так добра захаваліся.

Яшчэ некалькі зім — і палац пачне інтэнсіўна разбурацца, лічаць у Паланечцы. А яго адраджэнне, вядома, стала б імпульсам для развіцця не толькі гэтай вёскі, але і суседніх. Яно і зразумела, паток турыстаў, новыя рабочыя месцы для тутэйшых жыхароў прынеслі б пэўнае ажыўленне.

— Прадаецца аб'ект цяжка, — расказаў **кіраўнік Брэсцкага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці Павел МАНЬКО**. — Зноў выставілі на таргі. Можа, такім чынам знойдзецца зацікаўлены чалавек альбо арганізацыя. Гэтым разам кошт аб'екта зніжаны на 80 працэнтаў і складае 19 тысяч рублёў. Па сённяшнім курсе Нацбанка гэта менеш, чым за 9 тысяч долараў. Гэта пачатковая цана. Калі пакупнік будзе адзін, за такую суму ён можа атрымаць будынак палаца, гаспадарчыя пабудовы, а таксама зямельны ўчастак плошчай 3,3 гектара з правам арэнды на 50 гадоў. Паводле ўмоў аўкцыёну, новы гаспадар павінен правесці рэканструкцыю альбо рэстаўрацыю будынка, а таксама зарэгістраваць у Міністэрстве культуры ахоўнае абавязацельства на гісторыка-культурную каштоўнасць і выкарыстоўваць аб'ект на працягу трох гадоў з моманту ўводу ў эксплуатацыю. Таргі прызначаныя на 4 снежня.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Баранавіцкі раён.

БПС-СБЕРБАНК

Уважаемые Владельцы (физические лица) текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки, будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

